з насельніцтвам, вялі адкрыты дыялог, аператыўна рэагавалі на заўвагі, выпраўляючы недахопы ў сваёй працы, выкаранялі бюракратыю.

***Літаратура***

1. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стагоддзі: курс лекцый / П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў, П.І. Зялінскі і інш. – Мінск: РІВШ БДУ, 2002. – 656 с.
2. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 1794
3. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 1802
4. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 1808
5. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп.1, Спр. 2362
6. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 2366
7. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 2368
8. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 2884
9. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 2891
10. НАРБ. – Ф. 4-п, Воп. 1, Спр. 3551
11. Слука, А.Г. Беларуская журналістыка (1918 – 1941 гг.) : вучэб.-метад.комплекс / А.Г. Слука, Н.А. Зубчонак. – Мінск : БДУ, 2015. – 191 с.
12. Якія галоўныя абавязкі селькора? // Беларуская вёска. – 1926. – 12 снежня. – С. 3.

**Вікторыя Пяткевіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

# ЭВАЛЮЦЫЯ СПОСАБАЎ ПАЗІЦЫЯНАВАННЯ КРАІНЫ Ў ГЛАБАЛЬНАЙ МЕДЫЯПРАСТОРЫ

Нацыянальная сістэма СМІ прадугледжвае асобы від дзейнасці, накіраваны на замежную аўдыторыю. Пазіцыянаванне сябе як самастойнага актара на міжнароднай арэне – натуральная неабходнасць любой незалежнай дзяржавы. Большасць дзяржаў у свеце вядуць актыўную інфармацыйную дзейнасць на міжнароднай арэне, удзельнічаюць у абмене інфармацыяй, прычым гэтая дзейнасць пастаянна пашыраецца, мяняюцца яе кірункі, мэты і метады. Гэта звязана з шэрагам эканамічных, сацыяльна-палітычных і тэхнічных фактараў, як у саміх краінах – суб'ектах інфармацыйнай дзейнасці, так і ў свеце. На маштабы сучаснага міжнароднага абмену інфармацыяй істотны ўплыў аказваюць змены, якія адбываюцца ў міжнароднай палітыцы, пашырэнне і паглыбленне ўсіх відаў міжнароднага супрацоўніцтва.

Першыя спробы вяшчання на замежжа былі зафіксаваны ў 20-я гады мінулага стагоддзя, рэгулярная і мэтанакіраваная праца на аўдыторыю іншых краін пачалася на некалькі гадоў пазней і была абумоўлена ідэалагічным супрацьстаяннем краін або неабходнасцю метраполій

інфармацыйна забяспечваць былыя калоніі. Так, Брытанская вяшчальная карпарацыя (BBC) пачала сваю працу для слухачоў Аўстраліі і Новай Зеландыі ў 1932 годзе, савецкую ідэалогію на міжнародных хвалях прадстаўляла «Радыё Масква». У гэты час набірала сілу нацысцкая прапаганда, дзе радыё выкарыстоўвалася ў якасці сродку інфармавання шырокай аўдыторыі [6].

У час Другой сусветнай вайны на міжнароднай арэне выдзеліліся чатыры краіны з найбольш магутнымі рэсурсамі для міжнароднага вяшчання – гэта Вялікабрытанія, Германія, Расія і ЗША. Вяшчанне на замежжа ў пасляваенны перыяд «халоднай вайны» характарызуецца палярызацыяй краін у залежнасці ад прыхільнасці або варожасці камуністычнай ідэалогіі, прапагандысцкім характарам, што дакладна адлюстроўвала афіцыйную пазіцыю дзяржавы, з тэрыторыі якой адбываецца вяшчанне [6]. Шматпалярызацыя свету ў постсавецкі перыяд, узнікненне новых дзяржаў, пераарыентацыя міжкультурных камунікацый, укараненне новых тэхналогій прывялі да кардынальных змен у спосабах, метадах і сродках эфектыўнай камунікацыі праз масмедыя на сусветным узроўні.

Вывучэнне феномена міжнароднага вяшчання сёння прадугледжвае яго комплекснае асэнсаванне на розных гістарычных этапах і канструяванне патэнцыйных шляхоў развіцця. Базавае апісанне функцыянавання міжнароднага вяшчання разглядваецца ў спецыяльнай літаратуры (А. Панфілаў «Теория и практика радиожурналистики: международное радиовещание» (1981), М. Галядкін «Зарубежное иновещание» (1990), «Радиожурналистика» (под ред. А.А. Шереля, 2000)). Зразумець асаблівасці працы радыёстанцый у савецкі перыяд дазваляюць даследаванні навукоўцаў, апублікаваныя ў 70–80-я гг. XX ст. Да першых спроб навуковага асэнсавання феномена міжнароднага вяшчання адносяцца працы С.І. Бяглова «Внешнеполитическая пропаганда: Очерк теории и практики» (1984), Б.Г. Баннава, Г.М. Вачнадзэ «Чужие голоса в эфире» (1981), Г.М. Вачнадзэ «Критический анализ форм и методов империалистической пропаганды на СССР 1945–1976 гг.» (1978), А.Ф. Панфілава «Внешнеполитическая радиопропаганда империализма (Критический анализ теоретических и организационных концепций внешнего радиовещания США, ФРГ, Великобритании. 20-е–70-е годы)» (1981). У гэтых працах міжнароднае радыёвяшчанне падаецца як канал прапаганды камуністычных ідэй, цалкам суадносны з афіцыйнай дзяржаўнай палітыкай, таму і даследаванні адрознівае пэўная тэндэнцыйнасць.

Лібералізацыя медыяпрасторы ў постсавецкі час стала прычынай кардынальных змен у функцыянаванні рэдакцый міжнароднага вяшчання, што знайшло сваё адлюстраванне і ў адпаведнай навуковай літаратуры. Так, да дысертацыйных даследаванняў, якія раскрываюць асаблівасці гэтага віду масмедыя, адносяцца працы П.В. Васільева «Всемирная служба Би-би-си – канал британской внешней политики (история, формы, методы и принципы организации вещания)» (1990), С.Б. Беражковай «Радио «Свобода» в системе международного радиовещания на русском языке (1988–1994 гг.)» (1995), Л.У. Іваніцкай «Современное вещание на зарубежные страны: «Голос России» 1993–2003 гг. (Концепция, структура, жанровые особенности)» (2003), Д.А. Мірыманава «Культурная тематика в информационных телевизионных программах для зарубежной аудитории:на примере телеканала «RussiaToday» (2008), Г.С. Колчынай «Социокультурный феномен «Радио Свобода» в информационном пространстве современной России» (2008), І. Наовафа «Особенности регионального подхода в российском иновещании: история и современность» (2011), У.К. Іардана «Особенности направленного информационного радиовещания ФРГ на Россию» (2002), Ю.Я. Афанасьева «Современное международное вещание (Проблемно-тематическая структура информационно-аналитических программ «Радио Свобода» на русском языке)» (2005) і інш., дзе яскрава прасочваецца генезіс міжнароднага вяшчання ў глабальным сацыякультурным кантэксце, значная ўвага надаецца эмпірычнаму матэрыялу, які ілюструе вылучаныя аўтарамі гіпотэзы.

Даследаванне міжнароднага радыёвяшчання адрозніваецца сваёй фрагментарнасцю. Гісторыя, эвалюцыя, сучасная сітуацыя на міжнародным радыё «Беларусь» апісваецца ў артыкулах, апублікаваных у зборніках навуковых канферэнцый, навуковых часопісах, перыядычных выданнях. Міжнароднае радыёвяшчанне стала аб’ектам даследаванняў айчынных навукоўцаў. Так, А.І. Конанава разглядае гісторыю фарміравання міжнароднага радыёвяшчання ў Беларусі [3]; У.В. Фральцоў аналізуе функцыянаванне СМІ нашай краіны, арыентаваных на замежную аўдыторыю [7]; Н.Я Гальпяровіч і Р.Р. Прохараў вызначаюць асаблівасці працы радыё «Беларусь» у міжнародным эфіры на сучасным этапе і падаюць звесткі пра аўдыторыю гэтага сродку масавай інфармацыі [1]. Акрамя таго, міжнароднае радыёвяшчанне ў Рэспубліцы Беларусь неаднаразова станавілася аб’ектам публікацый у перыядычных выданнях: часопісах «Журналист»

(чэрвень 2012 г.), «Беларуская думка» (май 2008 г.), «Беларускі гістарычны часопіс» (верасень 2008 г.). Механізм стварэння вобраза краіны праз масмедыя паступова вывучаецца айчыннымі і замежнымі даследчыкамі (Фральцоў У.В., Вартанава А.Л., Манастырова В.В., Афанасьеў Ю.Я., Саламацін А.М.).

Для сістэматызацыі апублікаванай інфармацыі і паглыблення ў вывучэнні функцыянавання міжнароднага вяшчання ў Рэспубліцы Беларусь асаблівая ўвага была нададзена даследаванням, якія накіраваны не ўласна на замежнае вяшчанне як самастойны актар у медыяпрасторы, а на вывучэнне дзейсных метадаў і спосабаў прэзентацыі як самога СМІ, так і краіны, якую ён прадстаўляе.

У гэтым рэчышчы асаблівую значнасць уяўляе праца В.В. Манастыровай, навуковыя інтарэсы якой прадстаўлены ў даследаванні вяшчання кітайскага радыё для расійскай аўдыторыі. Дысертацыя «Методы продвижения образа страны в практике “Международного радио Китая”» (2011) [4] раскрывае ўзаемасувязь дзяржаўнай палітыкі, культурнай ідэнтычнасці тытульнай нацыі, гістарычных рэалій і камунікатыўных стратэгій Міжнароднага радыё Кітая, якое акумулюе гэтыя складнікі ў сукупным медыявобразе краіны для замежнай аўдыторыі. Вялікую ўвагу аўтар надае творчай дзейнасці журналістаў, паколькі менавіта журналісцкая праца дазваляе паказаць, як на практыцы працуюць механізмы пераканаўчай камунікацыі ў міжкультурным асяроддзі. Вопыт Кітая ў стварэнні пазітыўнага іміджу краіны, пераадоленні яе стэрэатыпнага ўспрымання даволі блізкі да рэалій Беларусі, што дазваляе праводзіць параўнаўчы аналіз некаторых аспектаў дзейнасці радыёстанцый абедзвюх краін.

Пашырыць веды па пытаннях функцыянавання міжнароднага вяшчання ў сучасных рэаліях дазваляюць даследаванні замежных навукоўцаў. У прыватнасці, у 2010 годзе Рэйтарскім інстытутам па вывучэнні журналістыкі (Оксфардскі ўніверсітэт) быў рэалізаваны маштабны праект «Міжнародныя навіны: забеспячэнне, запатрабаванасць і ступень даверу аўдыторыі ва ўмовах хуткіх змен медыяпрасторы», па выніках якога быў апублікаваны разгорнуты даклад у трох частках [8, 9, 12]. Каштоўная інфармацыя ў рэчышчы міжнароднага вяшчання на мяжы XX–XXI стст. прадстаўлена ў манаграфіі амерыканскага даслдечыка Манро Прайс «Публічная дыпламатыя і трансфармацыя міжнароднага вяшчання» [10]. У 2012 годзе быў апублікаваны зборнік навуковых артыкулаў па выніках міжнароднай канферэнцыі «Эвалюцыя радыё» (Партугалія) [11]. Прадстаўленыя матэрыялы дазваляюць

праводзіць параўнаўчы аналіз функцыянавання радыё ў розных краінах, вылучаць тэхналагічныя і тэхнічныя трэнды ў радыёжурналістыцы і на гэтай аснове фармуляваць найбольш прымальныя шляхі радыёвяшчання з Беларусі на міжнародную аўдыторыю.

Дэталёвая інфармацыя пра дзейнасць асобных СМІ прадстаўлена ў комплексных штогадовых справаздачах аб актыўнасці медыя, якія вяшчаюць на замежжа, падрыхтаванай Кансультатыўным органам па пытаннях публічнай дыпламатыі ЗША. Знаёмства з дакументамі такога тыпу дазваляе зразумець філасофію радыёстанцый, асаблівасці факусавання на той ці іншай аўдыторыі, узгодненасць дзяржаўнай палітыкі, фінансавых выдаткаў і медыякантэнту.

Акрамя таго, багатай факталагічнай крыніцай служаць вэб-парталы спецыялізаваных аб’яднанняў, сярод якіх агульнаеўрапейская радыёсетка EuranetPlus і агульнаамерыканскі Савет па пытаннях вяшчання (BBG), дзе размяшчаюцца звесткі пра СМІ, якія спецыялізуюцца на міжнародным вяшчанні, а таксама агляды, аналітычныя артыкулы па адпаведнай тэматыцы.

Разам з тым, існуе пэўны недахоп даследаванняў, прысвечаных патэнцыялу СМІ ў краінах, якія не з’яўляюцца ўладальнікамі медыяканцэрнаў сусветнага маштабу. У той жа час вялікая колькасць краін (Швецыя, Балгарыя, Швейцарыя, Японія, Чэхія, Славенія, Фінляндыя, Польшча і інш.) пазіцыянуюць сябе праз міжнароднае радыёвяшчанне, аднак вывучэнне асаблівасцей працы гэтых відаў СМІ прадстаўлена на іх нацыянальных мовах і ў даволі вузкім ракурсе. Падобная нераспрацаванасць адсылае даследчыкаў да вывучэння базавых прынцыпаў функцыянавання міжнароднага радыёвяшчання і лепшых сусветных прыкладаў, якія практычна дэманструюць узровень жыццяздольнасці СМІ такога тыпу.

### *Літаратура*

1. Гальпяровіч, Н. Аб дзейнасці Галоўнай дырэкцыі замежнага вяшчання (радыёстанцыя «Беларусь») Беларускага радыё па прапагандзе беларускай культуры і мастацтва / Н. Гальпяровіч // Беларускае радыё: гісторыя, сучаснасць, перспектывы развіцця: матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю Беларускага радыё. – Мінск, 2005. – С. 43
2. Голядкин, Н.А. Зарубежное иновещание / Н.А. Голядкин. – М., 1990.
3. Кононова, Е.И. Организация вещания на зарубежные страны: опыт Белоруссии / Е.И. Кононова // Журналистика в 2004 году. СМИ в многополярном мире: материалы научн.-практич. конф. Москва, 2-5 февраля

2005 г. / Московск. гос. уни-т. им. М.В. Ломоносова, Фак-т жур-ки, Союз жур-ов России; в 2 ч. Ч. 2. – Москва, 2005. – С. 27–29.

4. Монастырёва, О.В. Методы продвижения образа страны в практике «Международного радио Китая»: функциональные и творческие характеристики вещания на русском языке: дис. … канд. филол. наук : 10.01.10 / защищена 16.12.2011 / О.В. Монастырёва. – Благовещенск, 2011. – 202 л.
5. Панфилов, А.Ф. Теория и практика радиожурналистики. Международное радиовещание: учебн.-метод. пособие / А.Ф. Панфилов. – М., 1981. – 75 с.
6. Радиожурналистика [Электронный ресурс] / А.А. Шерель [и др.]; под ред. А.А. Шереля. – М., 2000. – Режим доступа: http://evartist.narod.ru/text5/44.html. – Дата доступа: 23.04.2016.
7. Фрольцов, В.В. СМИ Республики Беларусь для зарубежной аудитории / В.В. Фрольцов // Вестник БГУ. Серия 4. – 2007. – № 3. – С. 116–123.
8. Geniets, A. The global news challenge. Assessing changes in international broadcasts news consumption in Africa and South Asia: working paper / A. Geniets. – University of Oxford, 2010. – 115 p.
9. Geniets, A. Trust in international news media in partially free media environments. A case study of five markets in Africa and South Asia: working paper / A. Geniets. – University of Oxford, 2011. – 92 p.
10. Price, M. Public Diplomacy and the Transformation of International Broadcasting / M. Price // Cardozo Arts and Entertainment Law. – 2003. – № 1. – P. 51–85.
11. Radio Evolution: Conference Proceedings / University of Minho: Communication and Society Research Centre. – Braga, 2011. – 551 p.
12. Rotheray, B. Good News from a Far Country? Changes in international broadcast news supply in Africa and South Asia: working paper / B. Rotheray. – University of Oxford, 2010. – 134 p.

**Мария Ратько**
*Белорусский государственный педагогический университет им. Максима Танка*

# ПЕРИФРАЗА КАК СПОСОБ ВЫРАЖЕНИЯ КОННОТАТИВНЫХ ЗНАЧЕНИЙ В ПУБЛИЦИСТИЧЕСКИХ ТЕКСТАХ

Тексты публицистического стиля служат двум основным целям: передача информации массовым реципиентам, а также воздействие на их убеждения, мнения и эмоции. Зачастую недостаточно просто рассказать или напечатать о каком-либо событии, описав его таким, какое оно есть. Чтобы более эффективно донести информацию до зрителей / читателей, авторы публицистических текстов используют специальные средства и механизмы воздействия. Если в устной речи оратора такими механизма-